## АКРУЖЫМ КЛОПАТАМІ СЕМ'І НАШЫХ ВЫЗВАЛІЦЕЛЯЎ!

# ЗВАРОТ

### СЯЛЯН ВЁСКІ ВЕЛЯМІЧЫ ДА ЎСІХ ПРАЦОЎНЫХ ДАВІД-ГАРАДОЦКАГА РАЁНА.

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

Гераічная Чырвоная Армія з кожным днём наносіць удар за ўдарам па праклятаму ворагу. Нашы воіны, не шкадуючы свайго жыцця, змагаюцца і б'юць ворага на яго ўласнай зямлі. Недалёк той дзень, калі чырвоны сцяг перамогі ўзаўецца над цэнтрам фашысцкай бярлогі—Берлінам.

Наш доўг усімі сіламі і сродкамі дапамагаць нашай слаўнай арміі—вызваліцельніцы, акружыць усеагульнай увагай і клопотамі сем'і вызваліцеляў Радзімы, асаблівым клопатам акружыць дзяцей—сірат, бацькі якіх загінулі ў барацьбе за нашу свабоду, за шчасце нашых дзяцей.

Мы рашылі пры сельскім совеце стварыць фонд дапамогі сем'ям чырвонаармейцаў, партызан і дзецям-сіратам. Мы ўжо сабралі 1300 рублёў грашыма і 45 пудоў збожжа.

Звяртаемся да Вас, таварышы, паследаваць нашаму прыкладу і распачаць збор сродкаў у фонд дапамогі сем'ям франтавікоў, партызан і дзецям-сіратам.

Акружым заботай сем'і нашых слаўных воінаў-вызваліцеляў, дзяцей-сірат! Створым пры кожным сельсовеце фонд дапамогі сем'ям франтавікоў, партызан і дзецям-сіратам!

Няхай жыве наша слаўная Чырвоная Армія, якая вызваліла нас ад нямецка-фашысцкай пакуты!

Няхай жыве дарагі наш правадыр таварыш Сталін!

По даручэнню сялян в. Велямічы зварот падпісалі: Занкін А. М., Кузьміч А., Слуцкі В., Слуцкая М., Ранцэвіч А.

## РАМАНТУЮЦЬ ІНВЕНТАР

Разгарнуліся работы па падрыхтоўцы к веснавой сяўбе па МТС. Калектыў рабочых сабраў і закончыў рамонт усяго наяўнага сельскагаспадарчага інвентара. Прыведзены ў спраўнасці 2 радковых сеялкі, 7 параконных плугоў, 1 трактарны плуг, 7 культыватараў, 14 барон.

Значную дапамогу аказала МТС сялянам Аздаміцкага і Ольгомельскага сельсоветаў, куды былі накіраваны два кавалі, якія адрамантавалі 39 плугоў, 13 барон, 3 возы.

А. Кавалёў.

## КАЛІ ГЭТА СКОНЧЫЦЦА?

Адзінае месца для культурнага адпачынку ў райцэнтры—гэта дом соцкультуры.

Але, на жаль, наш раённы ДСК гэтаму не адпавядае. Падыходзячы да клуба, яшчэ за кіламетр чуцен шум. І калі хто захацеў культурна адпачыць, то замест гэтага атрымае адно мучэнне.

Пачынаецца яно каля білеткай касы, дзе заўсёды беспарадкі. За білетам дабрацца амаль немагчыма, таму што тут няма ніякай